Юрый ДАНІЛАЧКІН:

«НЯМА НЯЎДАЧ, ГЭТА ЎСЁ ВОПЫТ»

Погляд спартсмена на тое, як вывесці гарналыжны спорт у краіне на высокі ўзровень

Сэлфі з Пхёнчхана.

Усе мы згодныя з тым, што Беларусь павінна працягваць развівацца як краіна зімовых відаў спорту. Калі традыцыйныя для нас біятлон, фрыстайл і лыжныя гонкі больш-менш на слыху (па розных прычынах, у тым ліку з-за высокіх вынікаў), то гарналыжны спорт застаецца ў цені. Ці справядліва? У сезоне 2017/2018 Марыя Шканава і Юрый Данілачкін паказалі добрыя вынікі, пападанне ў лік 30 найлепшых спартсменаў свету на Алімпійскіх гульнях для такой нягорнай краіны, як Беларусь, не можа не ўсяляць аптымізму.

Гэты сезон стаў самым паспяховым за ўсю гісторыю развіцця гарналыжнага спорту ў краіне. Скончылі выступленні нашы спартсмены таксама паспяхова. Марыя Шканава выйграла адкрыты чэмпіянат Расіі ў слаламе, дзе былі прадстаўлены не толькі наймацнейшыя спартсменкі краіны-суседкі, але і гарналыжніцы іншых замежных дзяржаў, а Юрый Данілачкін заваяваў тры ўзнагароды на прэстыжным турніры ў Турцыі і на мажорнай ноце завяршыў цяперашні сезон. Мы сустрэліся са спартсменам, каб з першых вуснаў пачуць ацэнку алімпійскаму выступленню, пагаварыць аб развіцці гарналыжнага спорту ў Беларусі і абмеркаваць перспектывы падрастаючага пакалення.

«Хутчэй ты атрымаеш траўму дзесьці на вуліцы, чым на схіле».

— Юрый, калі ўспомніць Алімпіяду-2018 у некалькіх сказах...

— Спаборніцкая частка прайшла напружана. Мала таго, што схілы былі складаныя, дык яшчэ кожную раніцу даводзілася ехаць 45 хвілін, каб трапіць на гару, дзе праводзіліся спаборніцтвы па хуткасных відах. Атмасфера Гульняў была ў цэлым добрая. Ужо ў самым канцы, пасля завяршэння ўсіх спаборніцтваў, удалося знайсці час, каб падзяліцца духам Алімпіяды з блізкімі і адправіць некалькі паштовак. Я лічу гэта вельмі важным момантам, які дазваляе яшчэ шырэй распаўсюдзіць ідэалы алімпізму па свеце.

Што да майго выніку, то я зрабіў максімум з таго, што было магчымым. У федэрацыі гарналыжнага спорту ацанілі яго, як станоўчы. Рады, што змог трапіць у 35 найлепшых спартсменаў свету і дабрацца да фінішу ва ўсіх пяці дысцыплінах, у якіх я стартаваў.

— Якія думкі аб працягу кар'еры з'яўляюцца ў вас зараз?

— Думаю, што пайду яшчэ на адзін алімпійскі цыкл. Аднак мне б хацелася сумяшчаць работу спартсмена з трэнерскай дзейнасцю, быць так званым гуляючым трэнерам, каб дапамагчы падцягнуць беларускіх юніёраў на міжнародны ўзровень. У нашай моладзі ёсць вялікі патэнцыял, яны змогуць дацягнуцца да топ-30 Кубка свету, толькі трэба больш працаваць з імі ў тэхнічным плане.

— Што трэба зрабіць, каб гарналыжны спорт у Беларусі пачаў развівацца больш інтэнсіўна?

— У першую чаргу трэба жаданне і зацікаўленасць кіраўніцтва. Цяпер у нас гэта ёсць, і старшыня федэрацыі і наглядальны савет гатовыя зрабіць вялікую працу. Другое, неабходны пэўныя грашовыя ўкладанні, каб выбудаваць сістэму гарналыжных цэнтраў, заняцца адукацыяй трэнерскага складу, а потым ужо прыцягваць дзяцей праз школы, рэкламу і гэтак далей. У нас ёсць нядрэнныя спецыялісты, галоўнае, каб мы ўсе працавалі ў адным кірунку, каб у трэнераў было адзінае разуменне тэхнікі і фізічнай падрыхтоўкі.

Патэнцыял у гарналыжнага спорту велізарны, мы можам адбіраць дзяцей у хакея і тэніса, там падобныя каардынацыйныя трэніроўкі. Каб прыйсці да нас, дзіця не павінна мець нейкія асаблівыя здольнасці, калі няма супрацьпаказанняў да актыўнай дзейнасці — сардэчна запрашаем! Неабавязковыя пэўныя антрапаметрычныя даныя: на алімпійскім п'едэстале ў гарналыжным спорце — як хлопцы з ростам у 165 см, так і вышэй за 200 см.

— У якім узросце лепш прыводзіць дзяцей?

— Мяне паставілі на лыжы ў два гады і сем месяцаў. Самы аптымальны ўзрост чатыры-шэсць гадоў, пры тым, што гэтым відам спорту прафесійна можна займацца да 35, а то і даўжэй, гэта значыць палову свядомага жыцця.

Плюс гарналыжнага спорту ў тым, што дзеці заўсёды знаходзяцца на свежым паветры, так, яны могуць катацца ў дрэннае надвор'е, але ў канчатковым выніку гэта ўсё прыводзіць да таго, што арганізм дзіцяці гартуецца, становіцца больш моцным.

«Пасля Алімпійскіх гульняў у Сочы я прыняў рашэнне спыніць супрацоўніцтва са сваёй мамай. Гэта быў цяжкі час для нас абаіх».

— У інтэрнэце маса відэа з жудаснымі падзеннямі гарналыжнікаў, гэта досыць небяспечны від спорту.

— Хутчэй ты атрымаеш траўму дзесьці на вуліцы, чым на схіле. Тут усё залежыць ад падрыхтоўкі спартсмена: калі ў нейкіх кампанентах ёсць правалы, то цалкам лагічна, што здараюцца траўмы. Я маю на ўвазе не толькі фізічную падрыхтоўку, таму што мы складаемся не з адных цягліц, ёсць яшчэ і мазгі, і псіхіка, трэба займацца ўсім у комплексе.

У мяне, на шчасце, траўмаў было мала, хоць былі сур'ёзныя падзенні, у тым ліку на Алімпіядзе ў Сочы. Гэтую няўдачу можна аднесці да праліку ў псіхалагічным плане, я няправільна падышоў да старту, пачаў праходзіць дыстанцыю занадта агрэсіўна. Калі гарманічна ўсё развіваць, то траўматызм будзе зведзены да мінімуму.

— Вы настолькі захоплены гарналыжным спортам, што вядзеце блогі, а цяпер яшчэ і займаецеся перакладам фільма.

— Мне цікава расказваць пра гэта, ёсць шмат фанатаў гарналыжнага спорту, але ў большасці з іх абстрактнае ўяўленне пра наш від дзейнасці. Адна справа, калі ты глядзіш збоку, а іншая — калі стаіш на сваіх дваіх і едзеш гэтыя 150 км/г, адчуваеш усё знутры. Я не сутыкаўся з тым, каб хтосьці расказваў пра гарналыжнае «закулiссе», таму пачаў гэта рабіць, людзям спадабалася, я атрымаў станоўчы водгук. Хачу паказаць людзям, што горныя лыжы — гэта не тое, што мы з горачкі спускаемся неяк бокам.

Што датычыцца фільма «Штрайф. Адская гонка», з нямецкай мовы ён будзе перакладацца на рускую. Карціна паказвае гарналыжны спорт знутры, таму яго варта перакладаць і паказваць па тэлебачанні.

— Калісьці вы пераехалі з Піцера ў Мінск...

— Прайшло ўжо сем гадоў, Беларусь стала для мяне роднай краінай. У 2010-м са зборнай Расіі мяне не ўзялі на Алімпійскія гульні ў Ванкувер, хоць я быў адным з найлепшых у камандзе. Прычыны не растлумачылі, для мяне яны не зразумелыя і сёння. Потым зноў запрасілі ў зборную, але з адной умовай, што там не будзе майго трэнера — маці. Я адмовіўся, кіраўніцтва федэрацыі не захацела ісці мне насустрач. З'явілася магчымасць выступаць

за зборную Беларусі, я пагадзіўся і не шкадую. Тым больш цяпер, калі ў зборнай Расіі страшная сітуацыя — практычна палова асноўнага складу траўмаваная. Я жывы, здаровы, для спартсмена гэта вельмі важна.

— Цяжка, калі адзін з бацькоў — твой трэнер?

— Так, таму пасля Алімпійскіх гульняў у Сочы я прыняў рашэнне спыніць супрацоўніцтва са сваёй мамай. Гэта быў цяжкі час для нас абаіх, але я зразумеў, што трэба рухацца далей аднаму. Станавіцца самастойным спартсменам, чалавекам, мужчынам, мужам. Вядома, не абышлося без крыўдаў, але цяпер мы больш-менш далі гэтаму рады.

— Хутка спраўляецеся з няўдачамі?

— Я лічу, што ў мяне няма няўдач, гэта ўсё вопыт. Трэба адэкватна ўспрымаць свае магчымасці і вынікі, у мяне няма завышаных чаканняў. Думаю, я яшчэ не дасягнуў свайго піка, але рады, што ўдалося два разы трапіць у топ-20 на чэмпіянатах свету. Асобным радком для мяне стаіць выступленне на Кубку свету ў Кіцбюле ў хуткасным спуску. Спаборніцтвы там лічацца самымі складанымі і элітнымі, я добра паказаў сябе і заслужыў сваю долю павагі сярод спецыялістаў найвышэйшага ўзроўню.

— Каго лічыце найлепшым гарналыжнікам у гісторыі?

— Калі быў маленькі, захапляўся Херманам Маерам, гэта чалавек жалезнай волі, жалезнага характару. Пасля сур'ёзнай траўмы, якую ён атрымаў у выніку транспартнага здарэння (зваліўся з матацыкла), калена збіралі па частках. Пасля гэтага Херман устаў на лыжы і выйграў этап Кубка свету. А на дадзены момант найлепшы — гэта, вядома, Марсэль Хіршэр, ён ва ўсіх на вуснах, і гэта справядліва.

— Калі б не спорт, якую прафесію б выбралі?

— Я ўспрымаю горныя лыжы як працу з самага дзяцінства, не сказаць, што з-за бацькоў трэнераў у мяне не было выбару, быў, але я заўсёды вяртаўся, таму што гэта прыгожы, цікавы від спорту. Магчыма, змог бы стаць архітэктарам, мне падабалася нешта канструяваць. Думаю, мне падышлі б больш творчыя прафесіі. Дарэчы, раней я захапляўся фатаграфіяй, цяпер часам праглядаю здымкі з прыемнымі пачуццямі, маўляў, нішто сабе, як добра я мог гэта рабіць.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Сканворд



Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: Грамата. Унук. Трава. Еры. Скат. Скаба. Аўторак. Трал. Шмат. Ода. Рабчык. Бор. Удава. Баабаб. Лаз.

Па вертыкалі: Ганак. Анкета. Артыст. Аратар. Трапак. Сенбернар. Корт. База. Рамо. Лата. Адмова. Бра. Куб. Бал. Раз.

Даты | Падзеі | Людзі

14 КРАСАВІКА

1977 год — у вёсцы Раўбічы Мінскага раёна заснаваны Музей беларускага народнага мастацтва. З 2001 года — філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Пастаянная экспазіцыя музея размешчана ў вялікай зале і дзвюх прыбудовах. Экспазіцыя падзелена на дзве часткі: традыцыйнае мастацтва XVIII — 1-й паловы XX ст. і сучаснае — з 1960—1970-х гадоў. У экспазіцыі тканыя вырабы, прадметы хатняга ўжытку. Сярод унікальных экспанатаў: коўш-брацiна XVI ст.; драўляныя скульптуры святых з в. Нягневічы Навагрудскага раёна 1-й паловы XVIII ст.; царскія вароты з дрэва і саломы XVII—XVIII стст.; традыцыйныя вясельныя строі і шмат іншага. Тут прадстаўлены вырабы з в. Неглюбка Веткаўскага і Моталь Іванаўскага раёнаў, ганчароў з г. п. Івянец і інш. У адным з бабінцаў за шырокім сталом з лавай, сугучна сялянскім традыцыям, праходзяць сустрэчы і майстар-класы народных умельцаў. Працуе зала для часовых выставак.

1978 год — на пазачарговай 9-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР прынята Канстытуцыя Беларускай ССР. Новая Канстытуцыя была створана ў адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1977 г. У ёй было адзначана, што ў Беларускай ССР пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства. Канстытуцыя вызначала палітычную і эканамічную сістэму рэспублікі, прыярытэты сацыяльнага і культурнага развіцця, прынцыпы знешнепалітычнай дзейнасці.



1862 год — нарадзіўся Пётр Аркадзевіч Сталыпін, расійскі дзяржаўны дзеяч, міністр унутраных спраў і старшыня Савета Міністраў (з 1906 года), вядомы рэфарматар дарэвалюцыйнай Расіі. У 1902 г. быў прызначаны гродзенскім губернатарам. Па яго ініцыятыве ў Гродне былі адкрыты рамеснае, жаночае прыходскае і двухкласнае яўрэйскае вучылішча. Была заснавана імянная стыпендыя для найлепшых вучняў Гродзенскай мужчынскай гімназіі. У заходніх губернях Пётр Сталыпін ушчыльную пазнаёміўся з нацыянальным пытаннем, ён імкнуўся вырашаць яўрэйскія і польскія пытанні ў губерні. Ім быў створаны камітэт, закліканы клапаціцца пра патрэбы сельскагаспадарчай вытворчасці.

1902 год — нарадзіўся Якаў Уладзіміравіч Смушкевіч, савецкі военачальнік, двойчы Герой Савецкага Саюза (1937, 1939), генерал-лейтэнант авіяцыі. З 1919 г. на Заходнім фронце, удзельнік савецка-польскай вайны, баёў пад Баранавічамі, узяцця Смаргонскага ўмацаванага раёна. З 1922 года — у авіяцыі: камісар эскадрыллі (Мінск), камісар, начальнік палітаддзела, камандзір авіябрыгады ў Віцебску. Удзельнік баёў у Іспаніі на баку рэспубліканцаў. У 1939 г. камандаваў авіягрупай падчас баёў на р. Халхін-Гол. Удзельнік паходу Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь, савецка-фінскай вайны. У 1941 годзе арыштаваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1954 годзе.



1927 год — з канвеера шведскай фірмы «Вольва» ў Хісінгене (пад Гётэбаргам) сышоў першы аўтамабіль.

Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў сераду, 18 красавіка

Рубрыку вядзе Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com

■ Песню бярыце з сабою

ПЕРАПЁЛКА ПЛАЧА Ў ЖЫЦЕ

Паэту Анатолю Грачанікаву сёлета споўнілася б 80 гадоў. Ён пражыў кароткае творчае і грамадскае жыццё і ў росквіце свайго паэтычнага таленту заўчасна пайшоў ад нас у 52 гады. Можна толькі ўявіць сабе, колькі яшчэ цудоўных вершаў ён мог бы напісаць...

Анатоль Грачанікаў (08.09.1938 — 07.03.1991) — выдатны беларускі паэт, перакладчык, дзіцячы пісьменнік, грамадскі дзеяч. Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. У розныя гады працаваў галоўным рэдактарам часопісаў «Вясёлка», «Бярозка», «Маладосць». Аўтар шматлікіх зборнікаў вершаў, у тым ліку «Магістраль», «Круглая плошча», «Грыбная пара», «Калі далёка ты...», «Палессе», «Верасень», «Я вас люблю», «Выбранае».

Слова лечыць і калечыць.
Ёсць адно між розных слоў,
Што ў жыцці нас чалавечыць:
Слова светлае — любоў.

...Перапёлка плача ў жыце.
У траве гудуць чмялі.
Не гнявіце, а любіце
Ўсё жывое на зямлі.

Свет зачэзне і панікне
У адчаі без надзей,
Як яно раптоўна знікне
На зямлі сярод людзей.

Каб часінай непазбежнай,
Дзе жыцця круты абрыў,
Адказаць было не грэшна:
Што любіў? Каго любіў?

Вершы — Анатоль Грачанікаў, музыка — Яўген Ксяневіч.



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 6.11	20.09	13.58
Віцебск	— 5.59	20.02	14.03
Магілёў	— 6.02	19.59	13.57
Гомель	— 6.01	19.53	13.52
Гродна	— 6.27	20.24	13.57
Брэст	— 6.31	20.21	13.50

Месяц

Апошняя квадра 8 красавіка. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

***Пр.** Марыі, Абрама, Макара, Сяргея, Яфіма.*
***К.** Бернарды, Валерыі, Марты, Юстыны, Валяр'яна, Германа, Максіма.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Няма такога сіноптыка, які хоць бы раз у жыцці не адгадаў бы надвор'е.

— А як вы здагадаліся, што я дырэктар цагельнага завода?
— Ды па твары!

Добра касманаўтам — ім ніхто не ные: «Памый цюбікі, памый цюбікі...».

— Мама, можна мне цукерку?
— Толькі праз мой суп!

Пасля разводу з жонкай Сяргей у адзіночку выхоўвае і гадуе піўны жывот. А па выхадных нават катае яго на каруселях і амерыканскіх горках.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1432.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 красавіка 2018 года.